**Упраўленне па адукацыі, спорце і турызме**
**Старадарожскага раённага выканаўчага камітэта**

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Горкаўская сярэдняя школа Старадарожскага раёна”**

**Рэспубліканскі грамадзянска-патрыятычны праект**
**“Збяры Беларусь у сваім сэрцы”**


**Аўтар:**
**Кадушкіна Ганна Андрэеўна,**
**вучаніца 10 класа**
**ДУА “Горкаўская сярэдняя школа Старадарожскага раёна”**

**Адрас:**
**222920, Мінская вобласць,**
**Старадарожскі раён,**
**аг Горкі, зав. Школьны, 1**
**Email: gorki@starye-dorogi.by**


**аг Горкі, 2023**


1


3


4


6


2


Теребуты
...овичи
9
Левки
Дражно
Подоресье
12
Фаличи
11
Залужье
8
5
Стар. Фаличи
Каваличи
Нов.
Фаличи
Солон
Шапчицы
Новосёлки
Ореса
7
СТАРЫЕ ДОРОГИ
Александровка
6
14,15
1
13
10
3
Солон
Горки
ов. Дороги
Стар. Дороги
Пастовичи
Минковичи
2
Рабак
Языль
Верхутино
Макаричи
Оточка
Рубежи
Кармазы
Гостино
Пасека
Положевичи
Любанское
вдхр.
Синегов...
4
Глядовичи
Рухово
Кривоносы
Прусы
Бараново


15


1942
5


10


7


8


14


9


11


12


13

# ПОМНІК “РЭКВІЕМ”

Сотні мірных жыхароў, вайскоўцаў, партызан і падпольшчыкаў, людзей розных нацый, рэлігій склалі тут свае галовы. Было прынята рашэнне ўвекавечыць памяць аб загінуўшых грамадзянах на Старадарожчыне. Помнік “Рэквіем”, адкрыты ў 90-ых гг. ХХ ст., аўтар - Аляксандр Шацернік. Знаходзіцца ён на месцы масавага расстрэлу мірнага насельніцтва падчас Вялікай Айчыннай вайны. Помнік уяўляе сабой 6-метровы вобраз аргана, выкананы ў выглядзе сталёвых труб з рукой, якая вырываецца з зямлі. Трубы рознай даўжыні сімвалізуюць розны ўзрост загінуўшых. Трохі далей тры абеліска са знакамі іх рэлігійнай прыналежнасці: праваслаўная, каталіцкая, іўдзейская.



На гэтым месцы, у 1941 годзе, была падрыхтавана брацкая магіла для жыхароў Старадарожскага гета. 6 жніўня 1941 года частка мясцовых жыхароў-яўрэяў была выведзена ва ўрочышчы Кашарка. Іх прывялі да ямы, якая была загадзя падрыхтавана, загадалі зняць з сябе вопратку і пасля расстралялі з кулямётаў. На месцы расстрэлу яшчэ тры дні ўздрыгвала і варушылася зямля, з’ўляліся сляды крыві. Падчас адной з “акцый” (так нацысты называлі арганізаваныя імі масавыя забойствы) групу яўрэяў, уключаючы жанчын і дзяцей, немцы прымусілі распрануцца дагала, загналі ў раку з крыкамі: “Вымыйся, брудная жыдоўня!” і расстралялі ў вадзе.

19 студзеня 1942 года ў гэтае ж месца карнікі сагналі больш за 800 вязняў яўрэйскага гета і расстралялі ў рове каля першай ямы. Асуджаных людзей распранулі на марозе і расстралялі.

**З успамінаў М.А.Емельянавай, жыхаркі г. Старыя Дарогі:**

"У сям'і нас было 4 сястры і брат. Вайну памятаю, хоць і не хочацца яе памятаць, баліць сэрца, хочацца плакаць пры ўспамінах. Я была ў партызанах, пабыла і ў канцлагеры ў Гамбурзе. Мяне вялі на расстрэл. Немцы моцна білі мяне: далі 60 плётак. У мяне і зараз на целе ад іх сляды. Калі пачалася вайна, я была ў сваёй вёсцы, працавала ў калгасе на палявых работах.

Брат пайшоў у партызаны. Немцы даведаліся аб гэтым і забралі ўсю нашу сям'ю і хацелі расстраляць. А мой бацька нямнога ўмеў размаўляць па-нямецку, дзякуючы чаму нам сяк-так удалося выкруціцца. Праз некаторы час прыйшоў з лесу брат і забраў нас. Мы былі тры гады ў партызанскай брыгадзе А. І. Шубы. Як толькі немцам стала вядома пра партызан, было прынята рашэнне разбіцца на групы і размясціцца па вёсках Рухава, Рубежы, Краснае, Пад'яменец. Нас немцы злавілі ў Забалацці.

Сталі дапытваць, білі плёткамі, выбілі 2 зубы, паранілі ў левую нагу. А пасля зачынілі мяне адну ў хляве пад замок. Прасядзела я там трое сутак, а пасля павялі мяне на расстрэл 4 немцы. І тут адзін немец пацягнуў мяне ззаду і штурхнуў у кучу попелу. Я там упала і схавалася. Пасля людзі мяне выцягнулі адтуль, з той кучы, надзелі на мяне нейкія лахманы. Замест хусткі на галаве быў кавалак посцілкі. Завялі ў школу на другі паверх. Немцы шукалі мяне 3 дні і знайшлі. 30 кіламетраў вялі пешшу ў Бабруйск, а потым пасадзілі ў вагоны па 60 чалавек і адправілі ў Беласток. З Беластока – у нямецкі горад Зінзін. На размеркавальным пункце ўсе сцены і нары былі спісаны прозвішчамі.

У гэтым горадзе я прабыла 2,5 месяца. Нас кармілі хлебам напалову з апілкамі і раслінай, што нагадвала рэдзьку. Нават такога хлеба давалі толькі 100 грамаў на суткі. Пасля нас перавялі пешшу ў другі горад, дзе ўжо немцы нас выбіралі. Мяне забралі на фабрыку, дзе выраблялі серу для запалак. Тут я адпрацавала адзін год.

Ежы амаль не давалі, патрэбна было самім шукаць і дабываць. Жылі мы ў лагеры для рабочых. Гэта было ўжо ў канцы 1944 года. Калі сталі бамбіць лагер, нас сабралі і пагналі з лагера. Гналі доўга. У час бамбёжкі мяне прысыпала зямлёю. Колькі я ляжала – не ведаю. Людзі адкапалі, мне было вельмі дрэнна, мяне ванітавала, кружылася галава.

Мяне і яшчэ 37 чалавек хворых пакінулі, а астатніх пагналі далей. Нас немцы раздалі, як скаціну, па гаспадарах на хутары. Я тры тыдні працавала на хутары. Вызвалілі нас амерыканскія войскі і прапанавалі ехаць у Амерыку. Шмат хто з нас згадзіўся. Пасля вызвалення нас перадалі Чырвонай Арміі, якая нас і адправіла дамоў. Спачатку на машынах перавезлі ў Польшчу ў Картуз-Бярозу. Як толькі прывезлі –

адразу адправілі ў лазню, а пасля павялі ў парк. Пасля Польшчы нас прывезлі ў СССР.

На граніцы высадзілі, а адтуль дабіраліся дамоў самі, хто як мог. Я на таварным поездзе прыехала аж у Старыя Дарогі”.

# МІР-ГАРА



Вельмі цікавым помнікам Старадарожчыны, пра які складзена шмат паданняў, з’яўляецца Мір-гара. Знаходзіцца яна каля вёскі Новы Рабак, недалёка ад мяжы Старадарожскага і Слуцкага раёнаў. Гара мае прыродны характар і, як лічыцца, была ўтворана падчас дзейнасці ледавіка. Па меркаванні навукоўцаў, яна стала паганскім капішчам – месцам, дзе адбываліся рэлігійныя рытуалы язычнікаў. Паблізу знаходзяцца старажытныя пахаванні. Менавіта адсюль і магла пайсці ранейшая назва гары – Святая гара.

Па паданні, на гары некалі расла сасна, і аднойчы на ёй цудоўным чынам з’явіўся абраз. Мінаў час, і ад святой гары застаўся толькі пень, на які доўгі час , раз на год, на Пакровы, сяляне зносілі масла, сыр, мёд, палатно і іншыя ахвяры. Пасля над гэтым пнём была пабудавана драўляная царква з купалам, якая насіла назву Свята-Пакроўская і была заснавана князёўнай Соф’яй Слуцкай, жонкай князя Януша Радзівіла. Гэта адбылося ў 18 стагоддзі. З таго часу на Пакровы тут пачалі адбывацца вялікія святы і кірмашы, сюды з’язджаліся сяляне, рамеслінікі, купцы з вёсак і мястэчкаў Случчыны, Старадарожчыны і Любаншчыны.

Калі Соф’я Слуцая была далучана праваслаўнай царквой да ліку святых, яе абраз змянілі ў той царкве. І людзі, перш чым пачаць гандаль, маліліся Святой Соф’і Слуцкай. Праз некалькі стагоддзяў царква спарахнела, і ў 1867 годзе была пабудавана новая на грошы тытулярнага саветніка М.Я. Пігалеўскага.

Пры савецкай уладзе ў 1933 годзе царква была разабрана атэістамі з вёскі Сорагі і больш ужо не адноўлена. Старыя расказвалі, што званы падчас пабаженстваў чулі далёка ў навакольных вёсках. На месцы ж, дзе стаяла царква, былі знойдзены каваныя цвікі, а ў 1995 годзе быў пастаўлен крыж, да якога і сёння прыходзяць вернікі.

Яшчэ адно з паданняў пра гэта месца паведамляе, што недзе тут, на пні, падчас Паўночнай выйны паміж Расіян і Швецыяй (1700-1721 гг.) рускі цар Пётр 1 і шведскі кароль Карл 12 падпісалі мірнае пагадненне. Таму, маўляў, і назвалі месца Мір-гарой.

# СКУЛЬПТУРНЫ ПОМНІК
# “ПАДПОЛЬШЧЫЦАМ ГАННЕ КАРАЛЁВАЙ І СОФ’І БАБАКОВАЙ”

Размешчаны скульптурны помнік на паўднёвы захад горада Старыя Дарогі, каля аўтамабільнай дарогі Бабруйск-Слуцк. У лютым 1977 года Камсамольская арганізацыя райсельгастэхнікі звярнулася да ўсіх камсамольцаў з заклікам стварыць помнік маладым падпольшчыцам камсамолкам Г. Каралёвай і С. Бабаковай, якіх у кастрычніку 1942 года катавалі і жорстка забілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У фонд будаўніцтва помніка былі пералічаныя сродкі. І ў 1984 годзе плошчу насупраць механічнага завода ўпрыгожыў помнік - скульптурныя партрэты партызанак на высокім прамавугольным пастаменце. З успамінаў Міхаіла Белага, памочніка камісара брыгады імя Кірава па камсамолу, ганаровага грамадзяніна горада Старыя Дарогі:

“..Беларускія Зоі. Разведка данесла, што ў Глуску збіраецца нямецкая групоўка войск і рыхтуецца карацельная аперацыя супраць партызан і штаба злучэння. Камандзір атрада А. І. Шуба даў каманду выставіць засаду ля вёсак Рэпін і Забалацце. Паколькі фашысты маглі наступаць з боку Лясковічаў, то гэта пазіцыя была найбольш зручная для абароны. Пяць партызан пад камандай Віктара Гусева ўзялі ручны куля-мёт і ўначы заселі ў засадзе. Раніцай партызанкі-камсамолкі Ганна Каралёва і Соф’я Бабакова панеслі на пост снеданне.

Фашысты сталі наступаць не з Лясковічаў, а з Альбінска. Завязаўся жорсткі, няроўны бой. Удзельнічалі ў ім каля двух варожых батальёнаў, а абарону трымалі каля трыццаці партызан. У дадатак да гэтага апошнім не хапала боепрыпасаў. Партызаны зрабілі ўсё магчымае, каб затрымаць ворага, каб даць магчымасць мясцовым жыхарам пайсці ў лес. Немцы нашу засаду абышлі...

Калі ж мы ўвайшлі ў пакінутую немцамі вёску Альбінск, то пабачылі спаленыя хаты, забітых партызан. Сярод іх апазналі Сашу Несцяровіча. З ваеннымі ўшанаваннямі пахавалі таварышаў.

А вось Ганну Каралёву і Соф’ю Бабакову не знайшлі. Толькі праз некалькі дзён мы даведаліся пра трагічную гібель нашых беларускіх Зой...

Калі дзяўчаты раніцай неслі снеданне, то іх затрымалі і звязалі фашысты.

- “Партызанкі?” – дапытваліся немцы.

Дзяўчаты маўчалі, не спалохаліся і пабояў. Хаця ім абяцалі свабоду, калі апавядуць усё аб партызанах, іх штабе і абкаме партыі.

- “Нічога не ведаем”, – трымаліся свайго камсамолкі.

Іх прывезлі ў Глуск. І там дзяўчат апазнаў здраднік: «Яны са Старых Дарог». Камсамолак прывезлі ў Старыя Дарогі, дзе працягваліся жорсткія здзекі і катаванні. Не апавялі дзяўчаты нічога, не назвалі ніводнага імя.

У цэнтры горада ў сквeрыку была зроблена шыбеніца. Халоднай кастрычніцкай раніцай каты сагналі сюды старадаражан. Канваіры прывялі босых збітых партызанак у падраным адзенні. Але яны трымаліся мужна, літасці не прасілі.

У апошнія імгненні свайго жыцця паспелі крыкнуць:

- Бывайце, таварышы! Чырвоная Армія прыйдзе, фашысты будуць разгромлены!

Так па-геройску загінулі нашы актыўныя падпольшчыцы, нашы беларускія Зоі.

Іх помняць нашчадкі. Ля магістралі Масква-Варшава знаходзіцца бронзавы помнік гераіням. А ля яго – кветкі...”.

Из воспоминаний Е. Ревтович, бывшего подпольщика-партизана:

“..Адразу пасля акупацыі раёна гітлераўцамі дзяўчаты рашуча і смела ўключыліся ў падпольную барацьбу. Аня Каралёва жыла на кватэры ў маёй маці, а Соня Бабакова – насупраць нас са сваёй сястрой Надзеяй. Добра памятаю іх вясёлымі, жыццярадаснымі. Аня часта спявала, добра ўмела іграць на гітары.

Камсамолкі праводзілі разведвальную работу, аператыўна перадавалі звесткі аб варожым гарнізоне партызанам. Аднак гэта працягвалася нядоўга. Заставацца ім у горадзе было небяспечна.

Немцы пачалі падазраваць падпольшчыц. Прыйшлося дзяўчатам падацца ў лес да партызан. Тут яны выконвалі баявыя заданні: разносілі па вёсках лістоўкі, у час разгрому фашысцкіх гарнізонаў у Макарычах, Сінягова дапамагалі перавязваць раненых, а калі было патрэбна, удала стралялі з аўтаматаў.

Выконваючы чарговае заданне, партызанкі сутыкнуліся з варожай засадай. Прыйшлося ўступіць у няроўны бой. Яны не разгубіліся. Адзін за адным падалі фашысты ад куль партызанак…

Дзяўчат узялі толькі пасля таго, як у іх скончыліся патроны. Іх прывезлі ў горад Старыя Дарогі, жорстка катавалі, білі. Але ніводнага слова не вымавілі патрыёткі.

Стаяла восеньская раніца 1942 года. У цэнтры горада, у скверы, немцы тэрмінова будавалі эшафот. Сілком зганялі людзей на відовішча. Жандары і паліцэйскія штурхалі жанчын, дзяцей. Натоўп у напружанні чакаў – хутка павінны прывесці нявольніц.

Раптам нехта ціха прамовіў: “Вядуць”. Усе нібы па камандзе накіравалі свой позірк туды, дзе з’явіліся хударлявыя постаці партызанак са звязанымі рукамі. Асуджаных на смерць паставілі на табурэткі. Над галовамі ад ветру хісталіся шэрыя вяроўкі з петлямі. Чутна было, як

усхліпвалі жанчыны, моцна сціскалі кулакі старыя мужчыны, плакалі дзеці.

Ганна і Соня стаялі непахісныя, з горда ўзнятымі галовамі. Чорныя і апухлыя ад пабояў твары, парванае адзенне...

Доўга да шыбеніцы нікога не падпускалі. Праз некаторы час знайшліся людзі, якія знялі іх целы і пахавалі.

З таго часу мінула шмат гадоў. Але і сёння ў вачах стаіць страшэнная карціна жорсткай расправы над слаўнымі дочкамі Радзімы..”.



# МЕМАРЫЯЬНЫ КОМПЛЕКС У ГОНАР БАЙЦОЎ 121 СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ






Знаходзіцца мемарыял у аг. Сінягова, Старадарожскага раёна, 7 км. на поўнач ад аграгарадка, урочышча Гасцінскі Брод

З 6 па 12 жніўня 1941 г. у трыкутніку Вярхуціна-Рубяжы, Пчальнік-Гасціна, Сінегова-рака Арэса вяла жорсткія баі 121 стралковая дывізія. Тысячы байцоў дывізіі навечна засталіся ляжаць у лясах і балотах. У 1978 годзе на месцы баёў створаны мемарыяльны комплекс, які ўключае ў сябе штаб у выглядзе зямлянкі, скульптуру воіна з пісталетам-кулямётам, лясную студню і артылерыйскую зброю. Кампазіцыя дапоўнена фігурай жанчыны з дзіцем, якая сімвалізуе адзінства народа і арміі. На абеліску і дзвюх мемарыяльных дошках размешчана інфармацыя аб падзеях, якія адбыліся тут у гады вайны.



# ПОМНІК ПРАВЕДНІКАМ НАРОДАЎ СВЕТУ




Помнік Праведнікам народаў свету знаходзіцца каля в. Мядзведня.

Помнік Праведнікам народаў Свету быў устаноўлены ў 2001 годзе. Ён прысвечаны 10 жыхарам вёскі Вуглы, Мядзведня, Селішча Старадарожскага раёна. Яны, падвяргаючы сваё жыццё небяспецы, некалькі месяцаў ратавалі яўрэйскую сям'ю жыхара Мядзведні, каваля Айзіка Гельфанда. Увесь гэты час яны тайна прыносілі ежу і ўсё неабходнае для сям'і. У 1943 годзе сям'я Гельфанда была перапраўлена ў партызанскую брыгаду № 100 імя Кірава, з якой, дарэчы, супрацоўнічаў вядомы беларускі пісьменнік Алесь Адамовіч.

Але двое яўрэйскіх дзетак, Уладзімір і Сямён Гельфанды, памерлі ў той час, як сям'я вымушана была хавацца ў лесе ад рук карнікаў. Ім было ўсяго толькі тры і чатыры гады ад нараджэння.

Гэтыя камяні захоўваюць памяць аб памерлых Уладзіміры і Сямёне Гельфандах.

Званні Праведнікаў народаў Свету былі прысвоены:

Астрэйка Марыі,
Астрэйка Емельяну,
Астрэйка Івану,
Няронскаму Арсенію,
Няронскай Надзеі,
Дзядзюлі Уладзіміру,
Лыч Ганне,
Стасевіч Лаўры,
Стасевіч Ціне,
Мікуле Антону.

На жаль, у жывых з іх на тэрыторыі Старадарожскага раёна ўжо нікога няма.





# תעודת כבוד

# ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА

Сим утверждается, что на заседании комиссии по присвоению звания Праведника народов мира, созданной при национальном институте памяти катастрофы и героизма Яд-Вашем, от 12-XII-2000 на основе представленных свидетельств решено удостоить

זאת לתעודה שבישיבתה
ביום טו כסלו תשס"א
החליטה הועדה לציון
חסידי אומות העולם
שליד רשות הזיכרון יד ושם
על יסוד עדויות
שהובאו לפניה, לתת כבוד
יקר ל

**Анну Лыч**

נה ליץ

которая в годы фашистской оккупации рисковала своей жизнью ради спасения преследуемых евреев, звания Праведницы мира и наградить медалью Праведника народов мира. Её имя будет высечено на Стене почета в Аллее праведников Яд-Вашем.

על אשר בשנות השואה
באירופה שמה נפשה בכפה
להצלת יהודים נרדפים
מידי רודפיהם ולהעניקה
את המדליה לחסידי אומות
העולם.
שמה יונצח לעד על לוח-
כבוד בגן חסידי אומות
העולם ביד ושם.

Иврусалим, Израиль
13 · II · 2001

ניתן היום בירושלים
שבט תשס"א

Вось грамата адной з Праведніц Лыч Ганны Паўлаўны, якая жыла ў вёсцы Мядзведня і захаронена там жа на вясковых могілках.

# ПАШТОВАЯ СТАНЦЫЯ XIX СТ. У В. ПАСЬКАВА ГОРКА

У другой палове XIX стагоддзя па шашы Масква – Варшава непадалёку ад вёскі Горкі была пабудавана паштовая станцыя. Такія станцыі ўзводзіліся ўздоўж шашы праз 17-20 вёрст адна ад адной, каб стомленыя падарожнікі маглі адпачыць, паесці, змяніць коней. На паштовай станцыі знаходзіўся цэлы комплекс гаспадарчых і прамысловых памяшканняў – стайня для коней, адрыны для сены і экіпажаў, свіран, кузня. У кузні праезджы падарожнік мог падкаваць каня, замяніць кола ці зламаную вось, нацягнуць абады, падмазаць дзёгцем восі, адрамантаваць вупраж.



Дыліжанс-павозка для перамяшчэння пасажыраў на далёкія адлегласці. Пач. XX ст.

Для пасажырскага руху на Старадарожчыне выкарыстоўвалі такі від транспарту, як дыліжанс. Ён перавозіў пасажыраў і іх багаж. Гэты вялікі крыты экіпаж быў разлічаны на перавоз дваццаці пасажыраў. Пасажыры трэцяга класа размяшчаліся на страсе дыліжанса.

Для дастаўкі цяжкіх грузаў выкарыстоўвалі іншы від транспарту – балаголы. Балаголам называлі возчыка, які меў вялікі доўгі фургон і дужага каня з пароды цяжаравозаў. Гэтую цяжкую справу ў той час на Старадарожчыне “манапалізавалі” яўрэі.



Але адной з галоўных функцый паштовай станцыі была адпраўка пісем. Яны спачатку прымаліся і аплачваліся непасрэдна ў паштовай канторы, прычым тарыф істотна змяняўся ад адлегласці адпраўлення. І толькі пачынаўчы з 1844 года плата стала ўніфікаванай.

На паштовай станцыі вёскі Паськовы Горкі прыпыняліся нават два рускіх цара – Мікалай I і Аляксандр II.

У 1896 годзе ад станцыі Асіповічы Лібава-Роменскай чыгуначнай веткі да станцыі Старыя Дарогі была пабудавана чыгунка. І з цягам часу неабходнасць у конных транспартных сродках адпала, была наладжана перавозка пошты па чыгуначных дарогах. Так паштовая станцыя ў вёсцы Паськовы Горкі страціла сваё значэнне і ў хуткім часе была ліквідавана.

Наведаўшы паштовую станцыю ў вёсцы Паськавы Горкі, можна пазнаёміцца з помнікам архітэктуры канца XIX стагоддзя, даведацца аб гісторыі яе ўзнікнення, прызначэння і дзейнасці пры ўмове, што яна знаходзіцца на адным з важнейшых шляхоў зносін – шасейнай дарозе Масква – Брэст – Варшава.



# КАТАЛІЦКІЯ МОГІЛКІ КАЛЯ В. НАВАСЁЛКІ



Непадалёку ад вёскі Навасёлкі (па левым баку ад дарогі Горкі – Навасёлкі) захаваліся каталіцкія могілкі. На іх пахаваны прадстаўнікі роду Перасвет-Солтанаў. Тут жа калісьці знаходзілася драўляная каплічка, да якой у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя прыязджалі ў самыя вялікія святы і на пахаванні Перасвет-Солтанаў ксяндзы з Баранавіч і Нясвіжа. Сюды збіраліся католікі з найбліжэйшых вёсак на набажэнствы. Ёсць меркаванне, што каплічка была пабудавана па загаду Стэфаніі Перасвет-Солтан, якая была вельмі набожнай.

Больш за ўсё захавалася звестак аб Адаме Перасвет-Солтане. Пра яго ў сваіх творах пісаў пісьменнік XIX ст. Альгерд Абуховіч, а таксама навукоўцы Г.Кісялёў, А.Мальдзіс, Р.Родчанка, краязнаўца з вёскі Горкі Д.Мельнік.

Амаль неверагодна, але з'яўляецца фактам тое, што прадстаўнік найбуйнейшага магнацкага роду, члены якога лічылі сябе, няхай не па багацці, але па паходжанні, не меншымі за Радзівілаў, пісаў творы на беларускай мове! І гэта адбывалася ў той час, калі адзінымі носьбітамі беларускай культуры былі сяляне, бо ад яе адмовілася мясцовае дваранства і размаўляла ці па-польску, ці па-руску. На жаль, пра творы пана Адама сёння нічога невядома. Ёсць меркаванні, што Адам Перасвет-Солтан тайна прымаў удзел у паўстанні 1863-1864 гг. Але пасля задушэння паўстання ўлады не здолелі даказаць яго віну.



Помнік на магіле Перасвет-Солтана на могілках в. Навасёлкі

Добрыя ўспаміны захавалі пра Свайго пана Адама і сяляне. Так, старыя людзі згадвалі, што Адам Перасвет-Солтан да скасавання прыгоннага права актыўна ўдзельнічаў у лёсе маладых людзей пры стварэнні сям'і, аказваў ім дапамогу (даваўся хлеб на год і парсюк). Паншчына пры ім была не такой цяжкай, як у паноў па суседству.

Ёсць успаміны і пра апошняга ўладара Горак Мечыслава Перасвет-Солтана. Казалі, ён звычайна ездзіў у ваенным мундзіры, меў доўгую бараду. Калі ён памёр, як сцвярджаюць паданні, на шасці роўных чорных,

без адзінай плямы, конях быў завезены на могілкі каля вёскі Навасёлкі, адпеты і пахаваны ў шкляной труне. На пахаванні прысутнічалі не толькі прадстаўнікі роду Солтанаў, але і простыя людзі.

Пасля расійскія ўлады абвясцілі абмежаванне дзейнасці рымска-каталіцкай царквы і касцёлы ў Слуцку і Бабруйску перасталі існаваць. Тое ж чакала і каплічку на каталіцкіх могілках каля вёскі Навасёлкі.

Сёння тут можна пабачыць толькі фрагменты магільных пліт роду Перасвет-Солтанаў з надпісамі на польскай мове.



# СВЯТА-ГЕОРГІЕЎСКАЯ ЦАРКВА



Свята-Георгіеўская царква знаходзіцца ў сяле Залужжа. Яна была пабудавана ў 18 стагоддзі. Па сваёй кампазіцыі вельмі падобная да шырокавядомай Свята-Міхайлаўскай царквы ў Слуцку, якая ўцалела да нашіх дзён. У 1795 годзе гэта царква адна з першых у Беларусі была далучана з уніі да праваслаўя. Настаяцелем храма быў свяшчэннік Гаўрыіл Салаўевіч, які скончыў Слуцкую богачасцівую семінарыю.

Адразу пасля вайны з царквы былі скінуты купалы і званіца, а будынак прыстасаваны пад клуб. У 1991 годзе храм быў вернуты Праваслаўнай Царкве. Першым настаяцелем пасля вяртання храма быў свяшчэннік Леанід Верамейчык. Яго працай была адноўлена алтарная перагародка, абшыта невялікая частка сцен ўнутры і ўстаноўлены невялікі купал над цэнтральнай часткай храма. У 1996 годзе правы бок храма быў пераабстаўлены ў зімовы прыдзел у гонар Лаўрэнція, епіскапа Тураўскага. У храме знаходзяцца часціцы святых мошчаў.



Прыхадская Юраўская царква ў Залужжы.
Фота да 1910 г..

# ШЧЫТКАВІЦКАЯ ПРОШЧА



Щыткавичы «Проща» направа Барысъ Барсукъ молитца (Разсказчикъ о Прощѣ)

Прыблізна ў 1910 годзе, паводле сведчання знакамітага этнографа І. А. Сербава, каля вёскі Шчыткавічы, у лесе, была пабудавана Прошча. Яна, паводле ўяўленняў вернікаў, была надзеляна незвычайнымі сіламі і ўласцівасцямі. Прошчам пакланяліся, іх наведвалі, каб пазбавіцца ад хвароб, рабілі ахвярапрынашэнні (ручнікі, палатно, кветкі, ежу, грошы), кожную маладзіковую нядзелю там збіралася много людзей, у асноўным жанчын, якія маліліся і бралі жмені зямлі з таго месца, дзе, паводле аповедаў мясловых жыхароў в. Шчыткавічы, ляжала дзіцяня і дзе з'яўляліся Маці Боская і Ісус Хрыстос. Святар адпраўляў у Шчыткавіцкай прыпісной царкве абедню, потым з хрэсным ходам ішоў на Прошчу і служыў там малебень.






Пясок на гэтым святым месцы лічыцца лячэбным спецыяльна ад жаночых і вочных хвароб. Спроба "лячэння" ад хвароб раней быў такі: кожная асоба, жадаючы быць здаровай, ставіла крыж, а на крыжы прыбівала крыначку для ахвяравання грошай.

# СКУЛЬПТУРНАЯ КАМПАЗІЦЫЯ “ХЛЕБ-СОЛЬ”

Скульптурная кампазіцыя “Хлеб-соль” з’яўляецца сімвалам гасціннасці горада Старыя Дарогі. Яна размешчана на скрыжаванні вуліц Валадарскага і Кірава. Скульптура была выраблена ў мастацкай майстэрні горада Мінска. На жаль, аўтар гэтай скульптурнай кампазіцыі невядомы.



# КАМЕНЬ-ВАЛУН

У сівую даўніну беларусы, як і большасць старажытных народаў,шанавалі камяні і адводзілі ім значную ролю ў сваім жыцці. Існуе меркаванне, што самы вялікі з іх былі каліcьці волатамі, а пазней, за грахі перад небам. Былі ператвораны ў камяні.

Каля вёскі Старыя Фалічы ёсць камень-валун. Яго вышыня на паверхні прыблізна каля 3 метраў, шырыня- каля 6 метраў. Спроба перавезці гэты камень на іншае месца і выкарыстоўваць яго як экспанат аказалася марнай, бо камень глыбока знаходзіцца ў зямлі. Так і застаўся ён на сваім месцы як маўклівы сведак даўніх гістарычных падзей…



# ВОЗЕРА СКАЧАЛЬСКАЕ



Прыхаванае сярод лясоў возера Скачальскае невыпадкова лічыцца найбольш таямнічым і загадкавым на Старадарожчыне. І да цяперашняй пары недастаткова даследваны як ахутаная легендамі гісторыя яго паходжвання, так і незвычайныя ўласцівасці вады. Існуе паданне, паводле якога возера з’явілася на тым месцы, дзе правалілася царква. Другое апавяданне сведчыць, што шмат гадоў таму назад, у час вялікай засухі, кавалак балота, на месцы якога знаходзіцца возера, ад вялікай спякоты загарэўся, пагарэлае месца асунулася і запоўнілася вадой.Бясспрэчным з’яўляецца тое, што яно з кожным годам павялічваецца з прычыны абвалу берагоў. Старыя казалі, штоіх дзяды памяталі, як замест возера быў невялічкі ставок ці прыродная сажалка. Ні з якімі рэчкамі і канавамі возера не злучана. Найбольўая глыбіня яго каля берагоў. А пасярэдзіне нібы падводная  выспа з ілаватым грунтам.



Скачальскае возера знаходзіцца ў бассейне ракі Пціч. Плошча возера – 0,45 км.кв., даўжыня – 0,9 км, найбольшая шырыня – 0,67 км, берагавая лінія даўжынёй 2 км 530 м. Возера карыстаецца папулярнасцю сярод жыхароў раёна і шматлікіх гасцей з іншых мясцін. Яны верацъ, што Скачальскае валодае лекавымі ўласцівасцямі. Некаторыя штогод прыязджаюць на аздараўленне і зазначаюць,што адчуваюць сябе намнога лепш. Спецыялісты мясцовай інспекцыі па ахове прыроды і навакольнага асяроддзя знайшлі гэтаму сваё пацверджанне. Вада возера адметная павышаным утрыманнем у ёй кіслароду.Ну а адпачываючыя ў адзін голас сцвярджаўць, што купанне ў Скачальскім здымае стомленасць, надае бадзёрасць іпрыбаўляе сіл. Таму спякотным летнім днём на возеры вельмі мнагалюдна.

# КАМЕНЬ-СЛЕДАВІК

Некаторыя камяні лічацца цудадзейнымі. Да іх адносяцца следавікі. Яны маюць выбіты прыродай слядок рукі або нагі. Па меркаваннях людзей, гэта было звязана з дзейнасцю Багародзіцы, Хрыста і апосталаў.

Каля вёскі Старыя Дарогі таксама ёсць такі помнік старажытнасці. Па расказах старэйшых жыхароў, камень-следавік ляжаў паблізу старых могілак. Вяскоўцы шанавалі гэты камень, казалі, што на ім след Божай Маці. Калі ў савецкія часы праводзілася меліярацы, старыя могілкі былі знесены, і ўсе камяні былі звезены ў розныя месцы.

Месцазнаходжанне камня-следавіка доўгі час заставалася загадкай. Зусім нядаўна гэты камень быў знойдзены паблізу вясковых могілак.



# РАКА АРЭСА

Рака Арэса з’яўляецца самай вялікай і працяглай на тэрыторыі Старадарожскага раёна. Яна пачынаецца за 12 кіламетраў на поўнач ад вёскі Горкі, каля вёскі Падарэсссе. Даўжыня ракі складае 128 кіламетраў. Упадае рака Арэса ў раку Пціч на тэрыторыі Гомельскай вобласці.

Шырыня ракі Арэсы ў верхнім і сярэднім цячэнні складае 5-10 метраў. У ніжнім цячэнні шырыня ракі дасягае 15-20 метраў.

Глыбіні месцамі, асабліва ў ніжнім цячэнні, дасягаюць да двух метраў.



Жыўленне ракі снегавое і дажджавое.

Скорасць цячэння 0,3-0,5 метраў у секунду.

Рака Арэса вельмі маляўнічая. Зараснікі кустоўя ўздоўж яе прыгожых берагоў аблюбавалі салаўі. Іх непаўторныя спевы можна слухаць бясконца.

Горкаўскае вадасховішча было створана меліяратарамі ў 1982 годзе шляхам пашырэння рэчышча ракі Арэсы.

Даўжыня вадасховішча складае 460-480 метраў, шырыня ў цэнтральнай частцы складае 130-160 метраў. Глыбіні дасягаюць 2-2,5 метра.

Гэтыя ўмовы спрыяльныя для вялікай відавой разнастайнасці насельнікаў вадаёма. Тут сустракаюцца шчупакі, ляшчы, плоткі, карасі.

Аб рыбным багацці сведчаць таксама ўсплескі рыбы па паверхні вады.

Часта на воднай гладзі вадасховішча можна ўбачыць лебядзеў, або пачуць іх гукі



# МІНІДЭНДРАПАРК

У 2001 годзе непадалёку ад школы спецыялістамі Горкаўскага лясніцтва быў створаны мінідэндрапарк. Яго плошча складае 0,2 га.

На гэтай тэрыторыі расце 16 відаў самых разнастайных дрэў і хмызнякоў. Гэта: канадскі клён, спірэя, белая акацыя, востралісты клён, дзікая яблыня, сасна звычайная, ліпа, дзікая груша, туя заходняя, іва, кізільнік бліскучы, ясень ланцэтападобны, чырвоны дуб, шыпшына, дзерэн чырвоны, каліна звычайная.

Мінідэндрапарк таксама з’яўляецца доследнай пляцоўкай для прыродазнаўчых навук. Тут праводзяцца розныя даследаванні і назіранні.



